# Творы студэнтаў БДУКМ прадэманстравалі ў галерэі «З’ява»

- 17.03.2024

**Экспазіцыя «Родныя крыніцы» — гэта 97 работ студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва факультэта мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Творы дэманструюцца ў галерэі «З’ява» Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева.**



Анастасія Люцько са сваімі навучэнцамі.

На працягу многіх гадоў аддзел галерэйна-выставачнай дзейнасці бібліятэкі паспяхова супрацоўнічае з творчымі ўстановамі адукацыі нашай краіны. Выдатна, што ў спісе сяброўскага супрацоўніцтва значыцца цяпер і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Майстар вытворчага навучання, магістр мастацтвазнаўства, выкладчык кафедры дэкаратыўнапрыкладнога мастацтва факультэта мастацкай культуры дадзенай вышэйшай навучальнай установы Наталля Лінькова прывезла выстаўку ў Барысаў.



Напаўненне «Родных крыніц» простае і ў той жа час зразумелае кожнаму, хто быў і застаецца звязаны з гэтай ВНУ, хто сочыць за творчымі поспехамі яе педагогаў і выпускнікоў, хто блізкі да гістарычнай памяці ў прасторы мастацтва.

Між іншым, кожны выпускнік і педагог выйшаў са студэнцкага асяроддзя, дзе адораныя ўмела ўзрошчваюцца мэтрамі і становяцца талентамі. Сёння творы маладых талентаў — студэнтаў кафедры дэкаратыўнапрыкладнога мастацтва, а таксама кітайскіх студэнтаў і магістрантаў — экспануюцца ў выставачнай прасторы бібліятэкі Каладзеева. Іх можа паглядзець і ацаніць любы ахвотны індывідуальна і ў складзе групы. Канцэпцыю выстаўкі адлюстроўвае прыярытэтны напрамак развіцця кафедры, а менавіта сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі на аснове традыцый народнай творчасці. У экспазіцыі вы ўбачыце розныя віды тэхнік ДПМ — ткацтва, кераміку, батык, вышыўку, габелен, роспіс па тканіне, разьбу па дрэве, аплікацыю саломкай, саломапляценне і іншыя.

Падчас адкрыцця праекта ў галерэі «З'ява» сабраліся прадстаўнікі ўніверсітэта, педагогі і навучэнцы дзіцячай мастацкай школы імя А. А. Анікейчыка г. Барысава, супрацоўнікі і чытачы цэнтральнай бібліятэкі. Мастацтвазнаўца аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Анжэла Кудакова падзялілася ўспамінамі аб студэнцкіх гадах і магчымасцях, гэтага перыяду жыцця. Прадставіла Наталлю Лінькову — цудоўнага майстра і вопытнага выкладчыка ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Наталля Аляксандраўна расказала пра выстаўку, запрасіла будучых абітурыентаў на дзень адчыненых дзвярэй БДУКМ, прэзентавала буклеты з інфармацыяй пра ўсе кафедры факультэтаў



універсітэта.

— У мінулым годзе кафедра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва факультэта мастацкай культуры адзначыла 30-годдзе. У нас вучацца студэнты па спецыяльнасцях «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Рэстаўрацыя вырабаў» і «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Этнадызайн і народныя рамёствы». Большая частка прадстаўленых на выстаўцы работ — дыпломныя і курсавыя работы, навучальныя работы (керамічныя талеркі) студэнтаў першага курса, — дадала яна і падзякавала калектыву бібліятэкі.



*Наталля Лінькова ўручыла бібліятэцы і мастацкай школе падарункі — дэкаратыўныя пано.* Яны ўпрыгожаць памяшканні ўстаноў.
Кампетэнтнае меркаванне аб выстаўцы і пераемнасці традыцый творчых навучальных устаноў выказаў дырэктар дзіцячай мастацкай школы імя А. А. Анікейчыка г. Барысава Сцяпан Клімчук:

— Стала традыцыяй прадстаўляць творчыя навучальныя ўстановы ў галерэях бібліятэкі Барысава. У нашай школе працуе шмат выпускнікоў універсітэта культуры і мастацтваў. Яны — нашы вядучыя спецыялісты, як і ў іншых, падобных нашай навучальнай установе, школах і студыях. Гэтая плеяда прафесіяналаў у трэндзе. Дзякуючы прафарыентацыйнай рабоце навучэнцы знаёмяцца з профілямі творчых ВНУ, а сёння з вялікай цікавасцю прыйшлі на адкрыццё «Родных крыніц».

Слова мела і выкладчык дзіцячай мастацкай школы імя А. А. Анікейчыка г. Барысава Анастасія Люцько. Яна звярнула ўвагу будучых абітурыентаў на папулярнасць мастацкіх праектаў студэнтаў і майстроў БДУКМ у Беларусі і за яе межамі.

Свята адкрыцця выстаўкі ўпрыгожылі душэўныя кампазіцыі ў выкананні музыкантаў Старабарысаўскай дзіцячай школы мастацтваў.

Спадзяёмся, што супрацоўніцтва бібліятэкі Каладзе¬ева і ўніверсітэта культуры і мастацтваў атрымае працяг у іншых праектах.

**Алена БРЫЦКАЯ**

**Фота Элы ГАЛЬКО**